На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

Народная Воля

№ 155 (277)

Пятніца, 5 верасня 1997 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Выдавец — ТАА "Народная воля"
Кошт: у кіёсках і крамах — 2000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Сонца

	Усход	Захад
Віцебск	6.12	19.44
Магілёў	6.12	19.42
Гомель	6.12	19.37
Мінск	6.24	19.52
Гродна	6.39	20.07
Брэст	6.42	20.05

Першая квадра 10 верасня.

Слышали?

"Открытое общество" закрыто до лучших времен

3 сентября 1997 года в национальном пресс-центре республики директор Вашингтонского офиса Института "Открытое общество" Джон Фокс публично заявил о закрытии Белорусского фонда Сороса. Так завершилось преследование, начало которому положил президентский декрет номер 6 от 10 марта 1997 года.

Высылка из страны исполнительного директора фонда Питера Берна, появление сотрудников Совета безопасности в офисе фонда, наложенный на него налоговиками штраф в размере 3 миллионов долларов, замораживание банковских счетов, череда обманных движений официального Минска к разрешению проблемы при продолжающемся удушении, перспектива возбуждения уголовных процессов против сотрудников Наблюдательного совета Белорусского фонда Сороса и назревающая угроза экспроприации его собственности в счет погашения начисленного штрафа — таковы этапы борьбы власти с глубоко чуждым ей явлением "Открытого общества".

Такой оказалась черная неблагодарность деятелям и структурам широко известного в мире фонда, который начиная с 1993 года вложил свыше 13 миллионов долларов США в образование, культуру, средства массовой информации, неправительственные и правозащитные организации реформировавшейся Беларуси.

Политические итоги разгрома прискорбны. В самой республике резко сократились возможности развития гражданских независимых структур. Еще более осложнилось положение внутренней оппозиции нарастающему авторитаризму. В связи с изгнанием стимулятора демократического развития Беларусь окажется в еще более глухой изоляции мирового цивилизованного сообщества.

Очередная пиррова победа власти над обществом состоялась.

"Открытое общество" закрыто для Беларуси до лучших времен, но, как полагает Джордж Сорос, не навсегда. Его заявление по данному факту предлагается вниманию читателей "Народной воли" целиком.

Людмила МАСЛЮКОВА.

Заявление Джорджа Сороса

С большим сожалением я сообщаю, что действия белорусских властей привели к закрытию Белорусского фонда Сороса. Власти систематически оказывали давление на фонд, которое выразилось в нападках на его руководство, политически мотивированной проверке, несправедливых и непомерных штрафах, аресте банковского счета. В своих официальных заявлениях белорусское руководство демонстрировало желание о продолжении деятельности фонда Сороса в Беларуси, однако действия властей говорят о противоположном.

Мы пытались строить открытые и честные отношения с белорусским руководством. Тем не менее белорусские власти упорно продолжали действовать в направлении разрушения гражданского общества и в ущерб белорусскому народу, а также международному статусу Беларуси. Фактически Беларусь является единственной страной в блоке посткоммунистических государств, где наш фонд закрыт. Мы надеялись на то, что дискуссии с белорусским руководством смогут привести к решению этих проблем, однако их обсуждение не дало конкретных результатов. Мы будем готовы снова открыть фонд в Беларуси, как только появятся гарантии его нормальной деятельности.

Белорусские власти обвинили БФС в причастности к оппозиционной политической деятельности. Мы продолжаем отвергать подобные обвинения и можем лишь сделать вывод: руководство Беларуси имеет свое собственное понятие о том, что является политической деятельностью. Поддержка учеников и учителей начальных школ, дискуссионных клубов для старшеклассников и студентов, преподавателей естественных дисциплин или помощь университетам и больницам в подключении к компьютерной сети "Интернет", на мой взгляд, не является политической деятельностью. Не является также и поддержка независимых СМИ или правозащитных организаций — двух основных элементов открытого общества, даже если они выступают в качестве жестких, но политически нейтральных критиков, независимо от того, какое правительство находится у власти. Это и есть те сферы деятельности, развитию которых способствовал БФС и которые я поддерживаю как филантроп.

Я хотел бы поблагодарить сотрудников и Наблюдательный совет Белорусского фонда Сороса за их преданность и упорный труд, особенно в кризисной ситуации. Вы проявили высокий профессионализм и мужество. Я выражаю надежду, что во всех своих будущих начинаниях вы останетесь приверженцами принципов открытого общества.

В заключение я благодарю белорусский народ за поддержку и активное участие в работе БФС. Я надеюсь, что в этой работе нашли свое отражение ваши желания и устремления, и эта деятельность принесла пользу вашей стране. И если вы хотите, чтобы фонд продолжил свою работу в Беларуси, я призываю вас сделать так, чтобы это желание узнало руководство вашей страны. Будущее в ваших руках и в руках международного сообщества. Хотя БФС закрывает свои двери, я не захлопываю дверь перед белорусским народом. Я надеюсь найти способы поддержать тех людей в Беларуси, чья деятельность способствует развитию открытого общества. И я заверяю вас, что мы не пожалеем сил для того, чтобы стать свидетелями полного возобновления деятельности нашего фонда в Беларуси.

Столица России накануне своего 850-летия

В эти дни на Манежную площадь приходят жаждущие своими глазами увидеть возведенный к юбилею необычный архитектурный комплекс в виде купола, первый этаж которого символизирует XX век (напомним, что три нижних уровня уходят на "три века" вглубь). С построенной неподалеку от памятника маршалу Жукову эстрады привычно доносятся звуки настраиваемой аппаратуры и обрывки популярных песен...

Неподделен интерес людей к подготовительным мероприятиям.

В 12 часов дня 7 сентября здесь начнется масштабное шоу "Звезды ретро-850". В него включены выступления джазовых ансамблей, которые до семи часов будут ублажать любителей джаза в нескольких точках площади: на сцене, около гостиницы "Москва" и Манежа. Будут здесь и обычные оркестры, в том числе и приглашенные из Беларуси.

Анна ТЕРТЫЧНАЯ.

Беларусь рыхтуе Маскве свае віншаванні

Роўна 850 мінут прадоўжыцца беспрэцэдэнтная культурная акцыя "Славянскі свет вітае Маскву", якая адбудзецца 6 верасня на Краснай плошчы ў рамках афіцыйных урачыстасцей, прысвечаных 850-годдзю расійскай сталіцы. Як лічыць яе арганізатар прэзідэнт міжнароднай карпарацыі "Славянскі базар" Сяргей Віннікаў, па сутнасці, гэта акцыя будзе нечарговым фестывалем славянскага мастацтва, які на адзін дзень зменіць сваю пастаянную віцебскую прапіску на маскоўскую.

Свае віншаванні першапрастольнай рыхтуе і Беларусь. Апрача афіцыйнай дэлегацыі, якую ўзначаліць прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка, у Маскву з нашай рэспублікі прыбудзе і артыстычны дэсант. Як паведамілі карэспандэнту БелТА ў Міністэрстве культуры, свае песні і музыку падораць масквічам Аляксандр Ціхановіч і Ядвіга Паплаўская, ансамбль "Чысты голас" і Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга. Дарэчы, калектыву аркестра на юбілейных урачыстасцях адводзіцца асаблівая роля. Ён будзе не толькі суправаджаць выступленні зорак расійскай і сусветнай эстрады, але і прадаставіць усім удзельнікам акцыі сваю унікальную сцэну, на якой і разгорнецца асноўнае святочнае дзейства.

Акцыя "Славянскі свет вітае Маскву" з самага цэнтра расійскай сталіцы будзе паказана ў прамым тэлеэфіры. На сувязь з маскоўскай тэлестудыяй выйдуць сталіцы дзесяці славянскіх дзяржаў. Як паведамілі карэспандэнту БелТА ў Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі, для тэлемоста ў Беларусі падрыхтаваны невялікі сюжэт, дзякуючы якому масквічы змогуць пачуць віншаванні з юбілеем свайго горада і палюбавацца беларускімі пейзажамі, памятнымі мясцінамі Мінска.

Эдуард ПІВАВАР, БелТА.

Я считаю...

Иван Пашкевич – разрушитель белорусско-российской интеграции

Иван Пашкевич, заместитель главы Администрации президента Республики Беларусь, с первого дня пребывания в этой должности ведет беспощадную борьбу с российскими телеканалами. О своем намерении закрыть канал ОРТ и образовать вместо него БТ-2 Иван Иванович объявил журналистам уже на первой своей пресс-конференции. Тогда же он поделился с журналистами и своей заветной мечтой возглавить второй белорусский телеканал.

Информационная война государственных СМИ Республики Беларусь против Российской Федерации не прекращается ни на минуту. Отошли уже в прошлое такие способы борьбы, как запрет на передачу в Москву отснятого материала и лишение аккредитации корреспондентов российских телеканалов. Иван Пашкевич перешел в решительное наступление. Корреспонденты ненавистного ему ОРТ арестовываются как на месте съемки, так и в корпункте, в котором очень часто под видом поиска компромата учиняются погромы, без суда конфисковываются автомашины и [illegible] торых "администратор" без суда и следствия назвал преступниками, стал намекать на Чечню. Но там государственные чеченские структуры хотя бы формально стоят в стороне, а Иван Иванович говорит от первого лица, что дальнейшее развитие событий будет зависеть от Москвы. Нечем за журналистов Россия заплатить 2 миллиона долларов. А сколько запросил И.Пашкевич — главный ликвидатор на Беларуси российского телевидения? Именно такой вопрос возник у меня после той пресс-конференции.

Такой беспредел стал возможен из-за непринятия действенных мер со стороны руководства российских средств массовой информации, позволяющего вести беззастенчивую и вызывающую кампанию по дискредитации России и ее высших должностных лиц. Оскорбительные выпады против Российской Федерации в государственных белорусских СМИ приобрели систематический характер. Беспрецедентное информационное давление на Россию и провокационные акции, организуемые, на мой взгляд, Иваном Пашкевичем против ОРТ, ставят под угрозу бело- [illegible] провокационным акциям, действиям их организаторов и покровителей.

Валерий ЩУКИН.

Члены Сусветнай гандлёвай арганізацыі задалі Беларусі 247 пытанняў

Чарговы раунд перагавораў аб уступленні Беларусі ў Сусветную гандлёвую арганізацыю павінен адбыцца не пазней чым у снежні бягучага года. Аб гэтым паведаміў першы віцэ-прэм'ер Пётр Пракаповіч на пасяджэнні міжведамаснай камісіі, праведзеным у другой палове дня 3 верасня. Аднак падрыхтоўка да перагавораў яшчэ не завершана. Беларускія ўрадавыя структуры павінны адказаць на 247 пытанняў, якія паставілі перад імі дзяржавы — паўнамоцныя члены Сусветнай гандлёвай арганізацыі. Пытанні датычаць у асноўным адпаведнасці міжнародным нормам нашай заканадаўчай базы прынцыпаў валютнага і мытнага рэгулявання.

БелТА.

УКАЗ
Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
№ 444

Аб дадатковых мерах па ўпарадкаванню рэалізацыі алкагольных і тытунёвых вырабаў

У мэтах абароны інтарэсаў дзяржавы пры рэалізацыі алкагольных і тытуневых вырабаў п а с т а н а ў л я ю:

1. Устанавіць, што:

1.1. ліцэнзіі на імпарт тытуневых вырабаў у рэспубліку, якія выдаюцца пераможцам праведзенага ў 1997 годзе тэндэра (конкурсу), пачынаюць дзейнічаць з 1 верасня 1997 г.;

1.2. плата за выдачу ліцэнзіі на імпарт тытунёвых вырабаў бярэцца ў памеры 500 мінімальных заработных плат;

1.3. пры ўвозе дзяржаўнымі прадпрыемствамі (арганізацыямі) і арганізацыямі спажывецкай кааперацыі тытунёвых вырабаў авансавыя плацяжы па акцызах не бяруцца, а акцызы выплачваюцца па меры рэалізацыі ўвезеных вырабаў, але не пазней чым за 60 дзён з дня іх увозу;

1.4. алкагольныя і тытунёвыя вырабы, пераўтвораныя ў даход дзяржавы, рэалізуюцца толькі дзяржаўнымі прадпрыемствамі (арганізацыямі) або арганізацыямі спажывецкай кааперацыі. Пералік такіх прадпрыемстваў (арганізацый) зацвярджаецца аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам па ўзгадненню з Міністэрствам гандлю і Беларускім рэспубліканскім саюзам спажывецкіх таварыстваў. Пры гэтым разлікі з бюджэтам за рэалізаваныя вырабы праводзяцца не пазней чым за 10 дзён з дня іх рэалізацыі;

1.5. забараняецца рэалізацыя алкагольных і тытунёвых вырабаў, пераўтвораных у даход дзяржавы:

за межы Рэспублікі Беларусь;

дзяржаўным прадпрыемствам (арганізацыям) і арганізацыям спажывецкай кааперацыі па цэнах, якія перавышаюць цэны рэалізацыі такіх вырабаў, іншым юрыдычным асобам і іншым суб'ектам гаспадарання;

1.6. прамысловая перапрацоўка алкагольных, тытунёвых вырабаў і спірту, пераўтвораных у даход дзяржавы, ажыццяўляецца на прадпрыемствах, пералік якіх зацвярджаецца Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання па ўзгадненню з аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам;

1.7. утылізацыя алкагольных і тытунёвых вырабаў, пераўтвораных у даход дзяржавы, праводзіцца ў парадку, устаноўленым Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь;

1.8. дзяржаўная гігіенічная рэгістрацыя і сертыфікацыя алкагольных і тытунёвых вырабаў, пераўтвораных у даход дзяржавы, ажыццяўляецца адпаведна органамі дзяржаўнага санітарнага нагляду Міністэрства аховы здароўя і органамі Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі на працягу 7 дзён з дня паступлення ўзораў тавараў. Пры гэтым выдаецца заключэнне аб далейшым выкарыстанні (рэалізацыі, прамысловай перапрацоўцы або утылізацыі) алкагольных і тытунёвых вырабаў;

1.9. аптовыя цэны на алкагольныя і тытуневыя вырабы, пераўтвораныя ў даход дзяржавы, вызначаюцца адпаведнымі камісіямі пры аблвыканкамах, Мінскім гарвыканкаме, Кіраўніцтве справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Рознічныя цэны на гэтыя вырабы павінны ўстанаўлівацца зыходзячы з рознічных цэн на аналагічныя вырабы, існуючых у месцах іх рэалізацыі.

Для паскарэння рэалізацыі алкагольных і тытунёвых вырабаў, пераўтвораных у даход дзяржавы, рознічныя цэны на іх па рашэнню адпаведнай камісіі могуць быць зніжаны, але не больш чым на 20 працэнтаў. Прадпрыемствам (арганізацыям), якія рэалізуюць гэтыя вырабы, прадастаўляецца гандлёвая скідка з рознічнай цаны ў гарадах у памеры да 10 працэнтаў, у сельскай мясцовасці — у памеры да 15 працэнтаў;

1.10. кіраўнікі адпаведных дзяржаўных падатковых органаў абавязаны на працягу 10 дзён з дня паступлення рашэння камісіі аб ацэнцы алкагольных і тытунёвых вырабаў, пераўтвораных у даход дзяржавы, перадаць гэтыя вырабы на рэалізацыю, прамысловую перапрацоўку або утылізацыю;

1.11. алкагольныя і тытунёвыя вырабы, пераўтвораныя ў даход дзяржавы, падлягаюць маркіроўцы ва ўстаноўленым парадку.

2. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у двухмесячны тэрмін:

2.1. прыняць меры, накіраваныя на:

спыненне незаконнага гандлю алкагольнымі і тытунёвымі вырабамі;

узмацненне адказнасці службовых асоб прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый усіх форм уласнасці і прадпрымальнікаў, якія ажыццяўляюць дзейнасць без утварэння юрыдычнай асобы, за парушэнне парадку вытворчасці, захоўвання і рэалізацыі алкагольных і тытунёвых вырабаў;

забеспячэнне належнага захоўвання маёмасці, затрыманай, забранай, арыштаванай, канфіскаванай або пераўтворанай у даход дзяржавы іншым спосабам;

забарону разгрузкі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь тытунёвых вырабаў, што перавозяцца на аўтатранспарце ў мытным рэжыме транзіту, і ўвядзенне платнага суправаджэння такіх грузаў да мытнай граніцы Рэспублікі Беларусь;

2.2. устанавіць парадак утылізацыі алкагольных і тытунёвых вырабаў, пераўтвораных у даход дзяржавы;

2.3. прыняць меры па нарошчванню вытворчасці айчынных тытунёвых вырабаў для задавальнення патрэбнасці ўнутранага рынку рэспублікі ў гэтых вырабах і рэалізацыі іх на экспарт;

2.4. забяспечыць прывядзенне актаў заканадаўства, у тым ліку рэгулюючых парадак вызначэння цэн на пераўтвораныя ў даход дзяржавы алкагольныя і тытунёвыя вырабы, у адпаведнасць з гэтым Указам.

3. Гэты Указ уступае ў сілу з дня яго апублікавання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка.
2 верасня 1997 г.
г.Мінск.

Кантрабандны груз затрыманы

Спробу незаконнага правозу буйной партыі мяккай мэблі праз беларуска-польскую дзяржаўную граніцу спынілі супрацоўнікі аддзела па эканамічных злачынствах УУС Гродзенскага аблвыканкама. Прызначалася мэбля для адпраўкі з прыгараднай чыгуначнай станцыі Агульс у Новасібірск і Екацярынбург.

У час правядзення рэйду ў Ваўкавыскім раёне супрацоўнікі міліцыі звярнулі ўвагу на калону з трох дзесяткаў мікрааўтобусаў з прычэпамі, якія накіроўваліся ў абласны цэнтр. Нумары сведчылі аб тым, што яны з польскага горада Беластока. У ходзе праверкі таксама высветлілася, што вадзіцелі ехалі ў Гродна чамусьці не праз размешчаны паблізу пагранічны аўтапераход "Брузгі — Кузніца Беластоцкая", а абходным шляхам, з-пад Брэста. Падазрэнні аператыўнікаў апраўдаліся. Праверка дакументаў паказала, што за большую частку мэблі не заплачана мытная пошліна. Прычым вылічваецца яна значнай сумай, бо тавар каштуе прыкладна 400 тысяч долараў.

Кантрабандны груз і чатыры асобы, якія суправаджалі яго, затрыманы. Канал безакцызнага і бяспошліннага правозу мэблі праз граніцу і іншыя акалічнасці заведзенай крымінальнай справы цяпер высвятляюцца следствам.

Канстанцін БАЛАТЭВІЧ.
Гродна.

Дело о "полосатом бревне"

У защитников Павла Шеремета появились новые аргументы в пользу его невиновности.

Павел Шеремет на самом деле границу не нарушал — она проходит в 400 метрах от шлагбаума, который был показан в видеосюжете по ОРТ 23 июля. До настоящей границы Павлу пришлось бы шагать еще около полукилометра. Так называемые "центровые столбики", которые, собственно, и являются центром пограничной линии, вбиты в землю далеко за шлагбаумом. А "полосатое бревно", как называет шлагбаум четырехлетний сын Павла, на самом деле является обычным дорожным "заграждением", чтобы водитель, ненароком заехавший в пограничную зону по этой заброшенной дороге, дальше не смог проехать. Сами столбики, высотой около 50 см, найти в высокой траве (больше чем на метр вымахала!) почти невозможно. Хитроумные пограничники привязали к ним лозу, предварительно ободрав с нее кору, чтобы получился полосатый "пограничный знак". Павла и его группу это не спасло, до ошкуренных знаков они не доехали, но в уголовное дело влипли.

Опровергнуть доводы защиты, что никакого нарушения границы на самом деле не было, даже самому предвзятому суду вряд ли удастся. Защитники Шеремета намерены очень серьезно поработать над доказательством этого факта. Адвокат Михаил Волчек, который привлечен к делу наряду с адвокатом Гарри Погоняйло, считает, что многое решат нормативные документы (положения, инструкции, приказы), которые регламентируют обустройство и охрану границы. Если их не удастся получить в Беларуси (МИД может отказаться их выдать под тем предлогом, что они "совершенно секретны", хотя абсолютно достоверно известно — грифа "Секретно" на них нет), нормативные акты можно взять в Литве, они идентичны.

Адвокаты Павла Шеремета утверждают также, что в тюрьме на него оказывается психологическое давление. Когда его посадили в камеру гродненского СИЗО, на всю врубили вмонтированную в потолок аудиоточку. "Голосила" она день и ночь, пока заключенные не пригрозили голодовкой в знак протеста столь беспрецедентного нарушения их прав.

Читать газеты Павлу также не позволено, дважды отбирали телевизор. Во время последнего свидания с подзащитным адвокат показал ему публикацию в газете "Фемида-NOVA". Ворвавшийся в помещение охранник пытался выхватить газету и выставить адвоката. Это означало, что ни о какой "тайне общения" защитника и его подопечного речи нет, за ними велось наблюдение, скорее всего, их беседу прослушивали.

А теперь — "история с телевизорами". Первого, который Павлу передали коллеги с ОРТ, его лишили еще в начале августа под тем предлогом, что он-де перегорел. В середине августа отец передал Павлу второй телевизор. И его отобрали "для починки". В воскресенье, 31 августа, ведущий телепрограммы "Рэзананс" объяснил телезрителям: Павел так самозабвенно круглые сутки напролет "гоняет ящик", что он не выдержал и сгорел. А 2 сентября, приехав в Гродно, адвокат Михаил Волчек решил выяснить судьбу злополучного телевизора.

Оказалось, что электронное средство массовой информации было совершенно целехонько и отстаивалось в "каптерке" на складе гродненского СИЗО. Поздравляем, соврамши, господа "презонаторы"!

Из четырех отправленных Шереметом в адрес прокуратур области и республики жалоб и ходатайств (одно из них — о переводе в больницу в связи с ухудшением состояния здоровья) до адресата дошло только одно. Остальные в канцелярии тюрьмы не значатся, судьба их не известна.

А теперь о главном. Если граница де-факто и де-юре не была нарушена, можно ли счесть правомочным арест Шеремета и его группы? Были ли основания для возбуждения уголовного дела?

Комментирует адвокат Михаил Волчек:

— Основания для возбуждения уголовного дела, возможно, и были. Они предусмотрены Уголовно-процессуальным кодексом (ст. 105). Во-первых, в сюжете, показанном на ОРТ, ведущий сказал, что Павел Шеремет, заблудившись, пересек государственную границу. К тому же кто-то из пограничников мог подать об этом факте рапорт начальству. В подобном случае допускается возбуждение уголовного дела — чтобы инцидент расследовать, ведь нужны основания производить следственные действия, которые без возбуждения дела проводить нельзя (сделать обыск, начать экспертизу и так далее). Но факт возбуждения уголовного дела сам по себе ни о чем не говорит и никоим образом в данном случае не является основанием для ареста в качестве меры пресечения на время проведения следствия. Достаточно легко устанавливается тот факт, что нарушения границы не было, значит, и дело можно было бы уже давно прекратить за отсутствием состава преступления.

Ирина ДЕНИСОВА.

Кур'ер

Міхаіл Хвастоў узначаліць беларускае пасольства ў Канадзе

Намеснік міністра замежных спраў рэспублікі Міхаіл Хвастоў у бліжэйшы час адбудзе ў Канаду ў якасці Надзвычайнага і Паўнамоцнага пасла Беларусі ў гэтай краіне. Як стала вядома БелТА, канадскі бок ужо накіраваў у Беларусь неабходны для гэтай працэдуры агрэман.

Міхаіл Хвастоў — кадравы дыпламат, які доўгі час працаваў у прадстаўніцтвах нашай краіны пры міжнародных арганізацыях. Да назначэння намеснікам міністра замежных спраў ён займаў пасаду кіраўніка службы дзяржаўнага пратакола.

Цяпер у Канадзе знаходзіцца былы начальнік аддзела друку і інфармацыі МЗС рэспублікі Уладзімір Кабанаў. Ён займаецца абсталяваннем памяшкання для беларускай дыпламатычнай місіі.

БелТА.

Мінск.

Ну і ну!

Спірт у аміячнай абалонцы

У Смаргонскім раёне нядаўна пры правядзенні аператыўна-прафілактычных мерапрыемстваў супрацоўнікі Камітэта па арганізаванай злачыннасці і карупцыі з калегамі з МУС і тэрытарыяльных органаў унутраных спраў затрымалі дзве аўтамашыны МАЗ. У іх знаходзілася восемдзесят 210-літровых бочак з вадкасцю, якая ўтрымлівала спірт.

Адкуль жа ўзялося гэтае мора алкагольнай сыравіны? Было ўстаноўлена, што крыху раней на адрас аднаго са смаргонскіх канцэрнаў з Германіі паступіў груз — 126 бочак, аналагічных затрыманым. Згодна з дакументамі, у іх знаходзіцца раствор воднага аміяку на суму 23814 дойчмарак. Гэта сума якраз і прымусіла насцярожыцца ўніклівых аператыўнікаў і экспертаў: такая сыравіна ў Беларусі каштуе 500-700 тысяч рублёў за тону, але зусім не 15 мільёнаў, як атрымлівалася тут.

Вось чаму якасць праведзенай "растаможкі" грузу выклікала сумненне. Як высветлілася, яе ажыццяўлялі начальнік і старшы інспектар пункта мытнага афармлення ў прысутнасці інжынера мытнага аддзела таго самага канцэрна-грузаатрымальніка. Яны адкрылі для агляду толькі адну бочку, не звярнуўшы ўвагі на кошт грузу.

З мытні груз быў адрасаваны для захоўвання на мытныя склады грузаатрымальніка. Тавар аказаўся вельмі ходкім. У хуткім часе ён быў дастаўлены на адзін з мясцовых хутароў для некаторых хімічных працэдур. Прывезлі яго туды вадзіцель і ўладальнік адной з тых самых затрыманых машын, а таксама кампаньён з Літвы. Тут, на хутары, "народныя ўмельцы" правялі саматужнае выпарванне аміяку, які быў толькі ў 36 бочках. З астатнімі ёмістасцямі праблем не было: яны былі запоўнены 96-працэнтным этылавым рэктыфікаваным спіртам першага гатунку.

Па факту гэтага аміячна-спіртавога абароту заведзена крымінальная справа. Адразу ж пад варту быў узяты літоўскі камерсант. Ён, як высветліла следства, у якасці незаконнага ўзнагароджання ўручыў 300 долараў таму самаму інжынеру мытнага аддзела канцэрна за аказанне дапамогі ў афармленні грузу.

Сяргей ЦІВАНАЎ.

Здарэнне

Жывы факел на Варшаўскім мосце

Страшную карціну прыйшлося назіраць супрацоўнікам мытні "Заходні Буг" апоўначы 30 жніўня: жанчына абліла сябе спіртам і запаліла запальніцу...

Са шматлікімі апёкамі другой ступені яна была дастаўлена ў абласную бальніцу.

Як паведаміў карэспандэнту БелТА намеснік начальніка мытні Андрэй Лук, гэтая жанчына — брастаўчанка 1959 года нараджэння — была затрымана на аб'язной дарозе паблізу беларуска-ўкраінскага пагранпераходу "Макраны". На аўтамабілі "Нісан" яна спрабавала падпольна правезці на Брэстчыну з Украіны 480 літраў спірту. Пры затрыманні яна ўчыніла істэрыку, упрошвала адпусціць яе разам з кантрабандным алкаголем, на які, па водле яе слоў, былі пазычаны грошы. Нарэшце згадзілася прыехаць у Брэст на КПП "Варшаўскі мост", каб скласці пратакол і апрыходаваць спірт. Але паколькі слёзы, просьбы, пагрозы і істэрыка не спыняліся, супрацоўнікі мытні выклікалі "хуткую дапамогу". Пакуль "хуткая" была ў дарозе, жанчына выйшла з машыны і з прыхаванай бутэлькі абліла сябе спіртам...

І хоць мытнікі хутка збілі агонь, усё ж не абышлося без сур'ёзных апёкаў. "Хуткая дапамога" павезла яе ў бальніцу. Але нават знаходзячыся ў машыне, жанчына крычала, каб ёй аддалі спірт, які, як справядліва заўважылі ўрачы, каштуе ўжо ніяк не даражэй за здароўе і тым больш за жыццё.

Як хутка высветлілася, гэтая жанчына-"спіртавоз" ужо затрымлівалася ў красавіку бягучага года. Прычым вартавым граніцы прыйшлося нават страляць. Тады ў яе было канфіскавана і накіравана ў даход дзяржавы 517 літраў кантрабанднага спірту.

Іван КУКСА, БелТА.

Брэст.

Народная Воля 5 ВЕРАСНЯ 1997 г.

Стоп-кадр



Апошні круг.

Фота Рамана КАБЯКА.

Крымінал

Мяса па фіктыўных даведках

Факты продажу мяса на Смаленскім рынку Віцебска па фіктыўных ветэрынарных пасведчаннях выявіла абласная служба Камітэта дзяржаўнага кантролю рэспублікі. Як устаноўлена, 17 незарэгістраваных пасведчанняў выдала Шумілінская станцыя па барацьбе з хваробамі жывёл і 29 — Арлаўская раённая станцыя.

Кантралёры адхілілі ад работы некаторых службовых асоб і запатрабавалі ад абласнога ўпраўлення дзяржаўнага кантролю правесці дакументальную рэвізію, якая павінна выявіць поўную карціну здарэння.

Забойц[...]іста затрыманы

Жыхар вёскі Гарадка з Дзяржынскага раёна, які займаўся прыватным вознікам, з лета 1995 лічыўся прапаўшым без вестак. І вось пошук завершаны. Вынікі яго прывялі ў Мінск. Як паведаміў карэспандэнту БелТА супрацоўнік прэс-службы МУС Васіль Курловіч, 2 жніўня аператыўнікі крымінальнага вышуку ГУУС Мінгарвыканкама, Заводскага і Цэнтральнага РУУС сталіцы ў ходзе правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў затрымалі двух мінчан, якія нідзе не працуюць. Менавіта яны 29 ліпеня 1995 года нанялі гэтага прыватніка для паездкі ў Маскву. Але ад'ехалі толькі да пасёлка Плешчаніцы Лагойскага раёна. Тут каля лясного масіву бандыты нажом забілі вадзіцеля. Затым з мэтай утойвання злачынства цела закапалі на месцы забойства, а на ўкрадзенай машыне даехалі да горада Люберцы Маскоўскай вобласці, дзе яе прадалі. Расследаванне, якое праводзілася больш чым два гады, набліжаецца да завяршэння. Злачынцаў чакае суд.

БелТА.

Крокі прыватызацыі

Чаму "новыя капіталісты" не актыўнічаюць на аўкцыёнах?

Як ідзе ў Беларусі прыватызацыя? Што высвечваюць аўкцыёны? Ці звальняюць рабочых "новыя капіталісты"? Аб гэтым ішла дзелавая размова на прэс-канферэнцыі новага кіраўніка праекта Міжнароднай фінансавай карпарацыі "Малая прыватызацыя ў Беларусі" Карыма Ахмада.

Спачатку варта яго прадставіць. Карым Ахмад — грамадзянін Індыі, гісторык і эканаміст. Да прыезду ў Беларусь займаўся рэформамі ў Расіі. Апошні час "даваў жыццё" малой прыватызацыі ў Мінску.

Аналізуючы ход малой прыватызацыі ў Беларусі, спадар Ахмад звярнуў увагу на жнівеньскі сімптом. Што ж здарылася?

43 і 14

У жніўні было праведзена 9 аўкцыёнаў, на якіх выстаўляліся 43 аб'екты камунальнай гаспадаркі. Набылі новых гаспадароў толькі 14. Чаму так мала? Чым выкліканы спад? "Мёртвым сезонам" ці нечым большым? Здавалася б, малая прыватызацыя пры садзейнічанні Міжнароднай фінансавай карпарацыі набрала не благія абароты.

200-ы аўкцыён

Ён чакаецца ў кастрычніку. А ў канцы мінулага года адбыўся 100-ы. Адчуваеце, які ўзяты тэмп?

3 мая 1993 года па запрашэнню ўрада Беларусі Міжнародная фінансавая карпарацыя аказвае краіне дапамогу па правядзенню малой прыватызацыі. Работа гэта, дзякуючы фінансаванню праекта Агенцтвам ЗША па міжнароднаму развіццю, праводзіцца бясплатна і мае форму тэхнічнай дапамогі гарадам пры падрыхтоўцы аўкцыёнаў па продажу аб'ектаў камунальнай уласнасці, кансультацый для ўдзельнікаў прыватызацыйнага працэсу і членаў калектываў, у якіх з'явіліся новыя гаспадары.

Праект "Малая прыватызацыя ў Беларусі" праводзіцца ў 12 гарадах краіны. Што ж ён высвечвае?

Ці звальняюць "новыя капіталісты" рабочых?

Праведзена ўжо 183 аўкцыёны, на якіх прыватызавана 406 аб'ектаў. Дзяржаўная казна атрымала 10 мільёнаў 676 тысяч долараў выручкі.

Набыўшы новых гаспадароў, большасць прыватызаваных прадпрыемстваў пачала працаваць значна лепей. Паўсюдна зроблены рамонт памяшканняў, устаноўлена новае абсталяванне. Колькасць работнікаў не скарацілася, чаго баяліся вельмі многія, а значна павялічылася, вырасла іх зарплата. Прадпрыемствы пачалі працаваць эфектыўней. Вырас тавараабарот у разліку на квадратны метр плошчы і аднаго работніка. Павысілася культура абслугоўвання. Магазіны і кафэ прадоўжылі тэрмін работы.

Спадар Ахмад адзначыў яшчэ адзін добры штрых. Па яго словах, ён быў прыемна здзіўлены пасля знаёмства з многімі спецыялістамі на месцах. Яны даволі кваліфікаваныя і жадаюць працаваць на ніве прыватызацыі.

Дык чым жа выкліканы спад ў жніўні?

У чаканні Дэкрэта?

Спадара Ахмада непакоіць тое, што на аўкцыёны ўсё часцей выстаўляюцца памяшканні, незакончаныя аб'екты. Між тым, бізнесмены ахвотней купляюць гатовыя магазіны і кафэ ды яшчэ ў бойкіх гарадскіх месцах. Яно і зразумела — недабудаваны аб'ект патрабуе шмат сродкаў. А дзе іх узяць? А калі ў каго яны і ёсць, дык ён мяркуе ўкласці туды, дзе можна хутчэй атрымаць аддачу. А тут, пакуль давядзеш усё да ладу — шмат часу пройдзе. Ды і дзе ўпэўненасць у заўтрашнім дні?

А то ж усе чакаюць Дэкрэта прэзідэнта аб прыватызацыі. Якім ён будзе? Адны лічаць, што ён здыме ўсе праблемы. Другія прытрымліваюцца думкі, што дакумент яшчэ болей заблытае сітуацыю, а вырашэнне карэнных праблем, як ужо было не раз, будзе перанесена на потым.

Кіраўнік праекта МФК лічыць, што справа тармозіцца з-за нерашучасці ўрада, хоць абставіны падштурхоўваюць менавіта да рашучых дзеянняў. Калі ў цэлым у народнай гаспадарцы стратных прадпрыемстваў 20%, дык у сферы камунальнай гаспадаркі іх больш палавіны. Толькі прыватызацыя можа палепшыць тут справу.

Няма пакуль і роўных умоў для суб'ектаў гаспадарання. Так, дзяржаўныя прадпрыемствы гадамі не пачынаюць рамонт і нікога гэта не турбуе. А варта не правесці яго на прыватызаваных, як санэпідэмстанцыя, пажарныя тут як тут. Вядома, праверкі, рэвізіі ёсць паўсюдна, у любой краіне. Але з якімі мэтамі яны праводзяцца? Наколькі вопытныя спецыялісты імі займаюцца?

Як бачым, праблем пакуль хапае. І амаль усе яны, як кажуць, у полі палітычнай волі. У Беларусі пакуль распачата толькі "малая прыватызацыя" (у галіне камунальнай уласнасці). А калі пачнецца асноўная ці так званая вялікая?

Алесь ДРАБЧУК.

Задумаемся...

Что я могу сделать один?

Или перечитывая Солженицына сегодня

Помните, был такой этюд в студенческом театре МГУ (его неоднократно показывали по телевизору): выбегает человек на пустую сцену, растерянно оглядывается и бросает в смятении в темный невидимый зал: "Что я могу сделать один?" Потом появляется второй, третий, двадцать первый... Все с тем же вопросом. Как в броуновском движении, они беспорядочно и бестолково суетятся, толкаются и недоумевают: "Что я могу сделать один?" Они не видят друг друга, возможно потому, что не пытаются всмотреться и разглядеть.

Наша жизнь очень напоминает сегодня ту давнюю театральную сцену. Провели некий странный референдум, на котором выборщиков пришла голосовать почему-то под покровом осенней мглистой темноты; систематически избивают мирные демонстрации и просто случайных прохожих; оштрафовали за астрономическую сумму уважаемого человека за участие в праздновании Дня Конституции, которую он же как председатель Верховного Совета в свое время подписал; отлучили от профессии бывшего генерального прокурора, не разрешив ему заниматься адвокатской деятельностью; бывший премьер-министр в деревне пчел разводит, вроде как другого дела в государстве для него нет; высококвалифицированные судьи распущенного после референдума Конституционного суда, по сути, безработные, как и большинство бывших депутатов Верховного Совета 13-го созыва; отказывают в квалифицированной операции в специализированной клинике бывшему главе Нацбанка страны, ставя ее, пусть трижды неправедную жизнь, в смертельную опасность. Примеры можно множить, кажется, бесконечно. А ведь это сильные мира сего. Вернее, те, кто еще вчера были сильными.

Что же говорить о тысячах простых людей: униженных и оскорбленных несправедливостью, цинизмом, ложью сегодняшней белорусской действительности? И вроде есть общее ощущение, что живем ненормально, не по совести. Но все то же недоумение: "Что я могу сделать один?", те же упавшие безвольные руки: "Я — человек маленький", "от меня ничего не зависит", "не моего ума дело"... Социологи свидетельствуют — почти 40 процентам опрошенных вообще не интересно, что происходит в стране. Именно столько людей на вопрос еще не об аресте, а только лишь лишении аккредитации заведующего корпунктом ОРТ Павла Шеремета ответили: "Мне безразлично это событие", "Я ничего об этом не знаю" или "Затрудняюсь ответить".

Вообще-то, как свидетельствует история, бывает безразлично, ничего не известно и затруднительно ответить лишь до поры до времени. Пока круговорот событий со спокойной "обочины" нежданно-негаданно вдруг вытолкнет тебя самого или кого-либо из твоих родных и близких прямо на "проезжую часть". И тогда старенькая бабуля в съехавшем с седой головы платочке, которая еще вчера вместе с товарками по двору традиционно нежно любила всякую власть, которая сегодня за окном, вдруг спешит на многолюдный митинг, истошно голося: "Помогите подростка-внука освободить. Шел пацан мимо площади Свободы, а там молодежь против чего-то протестовала. Так и его случайно вместе с другими загребли. Батон дитятку передать не разрешили, во гады!" Этот самый "запретный" батон, кажется, навсегда отучил бабушку любить власть. Она, пережившая коллективизацию, войну, стройки социализма, вынести несправедливость к мальчику-внуку уже не может и не хочет. **Что она может сделать одна?** И пришла старуха к людям на площадь.

В канун прошлого референдума я случайно наблюдала за двумя пожилыми интеллигентными дамами, которые якобы прогуливались по двору. Одна из них оставалась дежурить у подъезда, а другая разбрасывала по почтовым ящикам газету со статьей, в которой были крик, мольба, призывы одуматься, раскрыть глаза, не дать одурачить себя в очередной раз. И надо же — в одном из подъездов "подпольщица" столкнулась с нарядом милиции, как раз дежурившим возле ящиков. Женщина спокойно поднялась на верхний этаж, переждала несколько минут. А затем, спустившись к ожидавшей ее подруге, громким театральным голосом посетовала, что "вечно эту Галину дома не застать". Чинно и мирно дамы удалились. А я и мои соседи читали поутру совсем не запрещенную газету, но, не принеси ее прямо в дом, всякий ли прочел бы? Кажется, каждая из этих женщин решила для себя сакраментальный вопрос **"Что я могу сделать одна?"**.

А совсем недавно познакомилась с юношей 22 лет, который из-за вполне понятной аполитичности ни разу не был на избирательном участке. За него голосовали родители так, как считали правильным. Парень вырос, и родительский выбор ему не нравится. В следующий раз он пойдет в кабину для тайного голосования. Самому сделать уже свой выбор. Это будет его и только его ответ на вопрос **"Что я могу сделать один?"**.

